**Канстытуцыйны Суд**
**Рэспублікі Беларусь**
**Сакратарыят**

**вул. К.Маркса, 32, 220016, г. Мінск**
**тэл./факс (+375-17) 327 52 09**
**e-mail: ksrb@kc.gov.by**

**Конституционный Суд**
**Республики Беларусь**
**Секретариат**

**ул. К. Маркса, 32, 220016, г. Минск**
**тел./факс (+375-17) 327 52 09**
**e-mail: ksrb@kc.gov.by**

17.09.2014 № 01-02-04/267

На № ____ ад ____

Рэспубліканскае праваабарончае грамадскае аб'яднанне "Беларускі Хельсінкскі Камітэт"
Вх. 01-14/42 14.10.2004

Старшыні Рэспубліканскага праваабарончага грамадскага аб'яднання
«Беларускі Хельсінкскі Камітэт»
Гулаку А.М.
вул. К.Лібкнехта, 68, офіс 1201
220036, г. Мінск

Паважаны Алег Мікалаевіч!

У дапаўненне да пісьма Сакратарыята Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 11 ліпеня 2014 г. зых. № 01-02-04/267 паведамляем, што Канстытуцыйным Судом неаднаразова разглядалася пытанне аб роўным выкарыстанні дзвюх дзяржаўных моў як у парадку абавязковага папярэдняга кантролю канстытуцыйнасці законаў, так і ў парадку рэалізацыі права ўносіць Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, у палаты Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, іншыя дзяржаўныя органы ў адпаведнасці з іх кампетэнцыяй прапановы аб неабходнасці ўнясення ў акты заканадаўства змяненняў і (або) дапаўненняў, прыняцця новых нарматыўных прававых актаў. Пры гэтым выкладаліся пазіцыі аб неабходнасці ўнясення адпаведных змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь» і іншыя акты заканадаўства, здольных забяспечыць фактычную роўнасць у выкарыстанні дзяржаўных моў, а таксама рэалізацыі права грамадзян карыстацца дзяржаўнымі мовамі ў асобных сферах іх жыццядзейнасці.

Падстаў для ўзбуджэння вядзення па справе ў парадку, прадугледжаным абзацам восьмым часткі трэцяй артыкула 22 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў, па выніках вывучэння Вашага звароту ад 7 ліпеня 2014 г. у Канстытуцыйным Судзе не ўстаноўлена.

З прапановамі аб вызначэнні ў заканадаўстве дадатковых механізмаў па рэалізацыі права грамадзян на карыстанне беларускай мовай Вы маеце права звярнуцца ў Парламент – прадстаўнічы і заканадаўчы орган Рэспублікі Беларусь.

Начальнік Сакратарыята А.В.Каравай

Кашчэева 327 67 76

з. 1171.